














# Тэатральнае свята ў Магілёве: «M.@rt.кантакт»

КОЖНУЮ ВЯСНУ Ў ГОРАДЗЕ НА ДНЯПРЫ АДБЫВАЕЦЦА МІЖНАРОДНЫ МАЛАДЗЁЖНЫ ТЭАТРАЛЬНЫ ФОРУМ «M.@RT.КАНТАКТ», ШТО ТРАДЫЦЫЙНА ПАДВОДЗІЦЬ КОНКУРСНЫЯ ВЫНІКІ Ў СУСВЕТНЫ ДЗЕНЬ ТЭАТРА. З 20 ПА 27 САКАВІКА ПРАЙШОЎ ДЗЕВЯТНАЦЦАТЫ ФОРУМ, АСНОЎНАЙ ПЛЯЦОЎКАЙ ЯКОГА, ЯК І ЗАЎСЁДЫ, З'ЯЎЛЯЎСЯ МАГІЛЁЎСКІ АБЛАСНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР.

**Анастасія Васілевіч**

*тэатразнаўца,*
*Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі*

- «Ганна. Сны». Арлоўскі дзяржаўны тэатр для дзяцей і моладзі «Свабодная прастора».
- «Заўтра была вайна». Ульянаўскі маладзёжны тэатр.
- «Чорныя дошкі». Уладзімірскі акадэмічны абласны драматычны тэатр.
- «Хутар». Беларускі дзяржаўны тэатр лялек.
- «Дама з сабачкам». Маскоўскі губернскі тэатр.
- «Лада, або Радасць». Тэатр-студыя «Невялікі драматычны тэатр».

**За гады існавання** «M.@rt.кантакт» вырасціў прафесійнага гледача і стаў утульным фестывальным домам для тэатраў з розных краін. Слова «маладзёжны» ў назве зусім не фармальнае. Па-першае, «M.@rt.кантакт» накіраваны на эксперыментальныя пастаноўкі і сучасны рэжысёрскі погляд. Па-другое, у межах форуму ладзіцца адукацыйная праграма — майстар-класы, лекцыі, семінары і майстэрня маладой рэжысуры.

Тут магчымы шчыры абмен поглядамі і досведам паміж пакаленнямі творцаў. Напрыклад, сёлета рэжысёр Аляксандр Бухарынаў з Расійскага дзяржаўнага інстытута сцэнічных мастацтваў прапанаваў эскіз спектакля паводле «Трамвая "Жаданне"» Тэнэсі Уільямса, а Уладзіслаў Лушчынскі з Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў — сцэнічную версію п'есы «Гандзі маўчаў па суботах» сучаснага расійскага драматурга Анастасіі Букрэевай.

Тэатр — мастацтва жывога дыялогу, прадметам якога так ці інакш з'яўляецца чалавек. І як бы таўталагічна ні гучала, лейтматыўнымі тэмамі форума сталі менавіта чалавек і каштоўнасць ягонага жыцця. Героі спектакляў «M.@rt.кантакту» спрабуюць перамагчы адзіноту і страх, знайсці апору ў сям'і і сяброўстве, прафесійнай справе, любові да сваёй зямлі. У вечнай барацьбе дабра і зла яны імкнуцца захоўваць чалавечнасць.

У пастаноўцы «Лада, або Радасць» паводле аповесці Цімура Кібірава ад Тэатра-студыі «Невялікі драматычны тэатр» з Санкт-Пецярбурга жыхары адной вёскі пачынаюць сябраваць праз клопат аб сабачцы. Рэжысёр Яўген Карпаў — вучань знакамітага Льва Эрэнбурга — прапануе гратэскную форму з элементамі фізіялагічнага тэатра і тэатра прадмета, у якой ёсць месца і трагізму, і камізму. Жывая мова, пазнавальныя персанажы, што знаходзяцца ў прасторы маленькага селішча, рэжысёрскае разважанне аб чалавечым выбары — і вось «Лада, або Радасць» названая найлепшым спектаклем форуму.

Сёлета прафесійнае журы падрыхтавала нямала спецыяльных дыпломаў, і гэта справядліва, бо праграма была моцнай. «Насферату» Пермскага тэатра «Век жыцця» атрымаў прыз «За захаванне спадчыны Мікалая Каляды». Стваральнік уральскай школы драматургіі добра вядомы магіляўчанам: шмат гадоў «M.@rt.кантакт» су-





■ «Чэхаў. Вадэвілі». Дзяржаўны рускі драматычны тэатр імя Фёдара Дастаеўскага.

працоўнічаў з майстрам, ён праводзіў майстар-класы і творчыя сустрэчы ў межах форуму. «Насферату» — гісторыя вельмі тэатральная ва ўсіх сэнсах. Гераіня, страціўшы ўсё ў сваім жыцці, вырашае аддаць асабістыя рэчы ў тэатр. Аднак у фінале перадумвае, бо менавіта рэчы захоўваюць памяць. Спектакль Андрэя Малянава па форме просты: маналогі актрысы перамяжоўваюцца пластычнымі сцэнамі. Аднак менавіта простая форма дазваляе сканцэнтравацца на тэксце і шчырасці яго выказвання.

Падводзіць вынікі жыцця і галоўны герой пастаноўкі «Чорныя дошкі» Уладзімірскага акадэмічнага абласнога драматычнага тэатра. Рэжысёр Уладзімір Кузняцоў вырашыў даследаваць творчы шлях свайго земляка — пісьменніка Уладзіміра Салаухіна. Праз вершы, апавяданні і аўтабіяграфічныя нарысы паўстае лёс не толькі самога Салаухіна, аднак і кожнага аўтара часоў СССР. Кампартыя, цэнзура, заданні ад Саюза пісьменнікаў — і адначасова спробы знайсці свой асабісты стыль, паразважаць на вечныя тэмы. Спектакль атрымаўся маштабным таксама па форме: псіхалагізм акцёрскага існавання, прыёмы паэтычнага тэатра, жывая музыка на сцэне, украпванне эстэтыкі візуальнага тэатра. Здавалася б, месцамі кітчава, месцамі занадта — аднак менавіта разнастайнасць дазваляе перадаць усю супярэчлівасць чалавечага жыцця. Пастаноўка атрымала ўзнагароду «За найлепшы акцёрскі ансамбль».

Спектаклі па творах Антона Чэхава — квінтэсэнцыя разважанняў аб чалавеку і ягоным светапоглядзе. «Чайка» Камілі Хусаінавай у Магілёўскім абласным драматычным тэатры атрымала прыз «За яркае рэжысёрскае рашэнне». Рэжысёр здолела далікатна перадаць чэхаўскую інтанацыю, пры гэтым наблізіўшы герояў да сучасных гледачоў. Гісторыя нібыта ператвараецца ў даследаванне «харчовага ланцуга»: хто каго «з'ядае» сваёй любоўю ў доме Аркадзінай. А дом гэты поўніцца шкілетамі Гаеўскай шафы (менавіта шафа паўстае як сцэна дачнага тэатра), надзеямі на будучыню ды сацыяльнымі маскамі (Трэплеў і Маша літаральна апранаюць іх на сцэне).

Не менш цікавую інтэрпрэтацыю твораў Чэхава прапанаваў Дзяржаўны рускі драматычны тэатр імя Фёдара Дастаеўскага з казахскага горада Сямей. «Чэхаў. Вадэвілі» Рача Махатаева гучны, яркі і дынамічны. Рэжысёр працуе з элементамі гратэску, буфанады і кабарэ, намагаючыся перадаць трагікамізм чэхаўскіх вадэвіляў. Тут і музыкі-клапы, якія граюць на піяніна, і намаляваныя чорна-белыя прадметы, што адсылаюць да эстэтыкі нямога кіно, і тэкставыя відэапраекцыі. Спектакль атрымаў узнагароду «За выдатны ўклад у развіццё тэатральных сувязей Беларусі і Казахстана», аднак яна, канешне, поўнасцю не адлюстроўвае творчы пошук рэжысёра.

Яшчэ адна пастаноўка паводле Антона Паўлавіча — «Дама з сабачкам» Маскоўскага губернскага тэатра. Ала Рашэтнікава вырашыла пайсці за аўтарам і з дапамогай сучаснай рэжысёрскай мовы зрабіла зразумелы гледачу спектакль, за што атрымала прыз «За трапяткое ўвасабленне рускай класікі». Такой жа зразумелай па рэжысёрскіх прыёмах аказалася і «Пікавая дама» Смаленскага камернага тэатра: сцэнічны твор Пятра Арлова напоўнены музыкай, пышнымі касцюмамі і сцэнаграфічнымі фокусамі. А прыз Смаленскі камерны тэатр атрымаў «За стварэнне яркага, выразнага вобраза графіні Ганны Фядотаўны — актрыса Надзея Трапезнікава». І сапраўды, менавіта гэтая актрыса з'яўляецца галоўным стрыжнем акцёрскага ансамбля ды ўтрымлівае пастаноўку на ўзроўні якасці.

Ваенную тэму на фестывалі раскрывалі два спектаклі — «Заўтра была вайна» Ульянаўскага маладзёжнага тэатра імя Барыса Аляксандрава і «Хутар» Беларускага дзяржаўнага тэатра лялек. Апошні ў прадстаўленні не мае патрэбы: квіткі на пастаноўкі Яўгена Карняга ў Мінску дастаць складана, а сам рэжысёр не так даўна атрымаў «Залаты сафіт» — галоўную тэатральную прэмію Санкт-Пецярбурга. «Хутар» вырас з аповесці «Знак бяды» Васіля Быкава, якую рэжысёр увасобіў з мастачкай Таццянай Нерсісян і кампазітарам Кацярынай





■ «Насферату». Пермскі тэатр «Век жыцця».
■ «Пікавая дама». Гродзенскі абласны тэатр лялек.
■ «Дзядзечкаў сон». Тэатр «Школа драматычнага мастацтва».
■ «Чайка». Магілёўскі абласны драматычны тэатр.

*Фота з архіваў тэатраў.*







Аверкавай. Гэтыя творцы таксама маюць дачыненне да магілёўскай сцэны: Кацярына Аверкава пэўны час з'яўлялася мастацкім кіраўніком драматычнага тэатра, а Таццяна Нерсісян актыўна працавала з рэжысёрам Ігарам Казаковым у тутэйшым тэатры лялек.

«Хутар» — цалкам аўтарскі спектакль, дзе акцёры працуюць як з лялькамі, так і жывым планам, рэжысёр актыўна выкарыстоўвае прыёмы візуальнага тэатра і тэатра прадмета. Гісторыя Сцепаніды і Петрака, на чый хутар прыходзяць немцы, становіцца разважаннем аб выбары, любові да Радзімы і чалавечнасці. Пастаноўка атрымала прыз «За найлепшую сцэнаграфію» і, дарэчы, стала «Найлепшым спектаклем форуму» па меркаванні маладзёжнага журы. *(Гл. таксама рэцэнзію Яўгеніі Бачыла «Адна прастора, шмат адценняў», «Мастацтва» 2026, № 2.)*

А «Заўтра была вайна» Ульянаўскага маладзёжнага тэатра імя Барыса Аляксандрава ўзяла ўзнагароду «За актуальнае ўвасабленне ваеннай тэматыкі ў сучасным тэатры». Гледачу прапануюць разабрацца не толькі ў ваенных часах, якія так ці інакш заяўлены ў спектаклі, а яшчэ і ў прадваенных, здавалася б, мірных. Рэжысёр Аляксей Храбскоў, як і Карняг, даследуе чалавечы выбар. Праз гісторыю школьнага класа прарастаюць тэмы здрады і адказнасці, унутранай вайны, што вядзецца супраць блізкіх. Вайна ў вайне — нібыта так можна акрэсліць ідэйны каркас аповесці Барыса Васільева: усё пачынаецца з ідэалагічнай вайны ўнутры школы, а сканчваецца Вялікай Айчыннай вайной, на якой амаль усе выпускнікі гераічна загінулі.

**«M.@rt.кантакт» — заўсёды пошук. Новых формаў, ідэй, тэатраў-удзельнікаў — дарэчы, на гэтым фестывалі прысутнічалі прадстаўнікі Пекінскага гарадскога цэнтра выканальніцкіх мастацтваў Дахуа. І гэты пошук спрыяе развіццю — як самога форуму, так і тэатральнай прасторы Беларусі. Наступны год для Міжнароднага маладзёжнага тэатральнага форума «M.@rt.кантакт» — юбілейны. І свята тэатра ў Магілёве будзе яшчэ больш маштабным.**